Патаповіч В.А., студ. гр. 514 ФТБК і СМ
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Гуд П. А.,
канд. гіст. навук, прафесар

# ВЫКАРЫСТАННЕ НАРОДНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ КРАІН СССР: БЕЛАРУСКІ КІРМАШ, ЯК СРОДАК ЗНОСІН У МЕЖАХ ПАЛІЭТНІЧНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА СУЧАСНАГА ГОРАДА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сапраўдным багаццем, выпрацаваным многімі пакаленнямі, сродкам перадачы накопленага вопыту і традыцый у эмацыянальна-вобразнай форме з'яўляюцца народныя святы і абрады. Ва ўсе часы традыцыйная культура прадстаўляла сабой адлюстраванне стану грамадства ў цэлым: сацыяльны змест яго жыцця, формы паводзінаў, звычаі, норавы, якія адпавядаюць існуючаму тыпу сацыяльных зносін. Мары пра народнае шчасце, якія існавалі ва ўсе часы, безумоўна знайшлі яркае ўвасабленне ў фальклоры народаў СССР. Менавіта таму такім актуальным у той час быў выхаваўчы патэнцыял народных традыцый і фальклора. Яны дазвалялі пазбавіць святочна-абрадавае дзейства пасіўнай відовішчнасці, пераўтварыць тэатралізаваныя формы мастацка-масавай работы ў сацыяльна-культурную самадзейнасць людзей, арганічна звязаную з іх працай і бытам.

Аднак калі прааналізаваць шляхі выкарыстання народных традыцый і фальклора ў мастацка-масавай рабоце, можна заўважыць, што ў той перыяд найбольш інтэнсіўна развівалася разуменне іх як асновы рэпертуару мастацкай самадзейнасці, прафесійных калектываў, ці рыса канцэртна-відовішчная.

Традыцыйныя формы народнага гуляння спалучаліся з новым асэнсаваннем іх сацыяльнага зместу, таму справядліва будзе адзначыць арганічнае аб'яднанне элементаў традыцыйнага карнавала, народнай

скамарошыны з вострай палітычнай і эканамічнай сатырай на актуальныя негатыўныя з’явы сучаснасці.

Першыя нацыянальныя святы савецкіх рэспублік неслі ў сваёй аснове здаўна распаўсюджаныя масавыя формы бытавання народных традыцый і фальклора.

Такім чынам можна адзначыць шырокае выкарыстанне народных традыцый у святах Беларусі, Украіны, Узбекістана, Грузіі і інш. Яскравыя прыклады гэтага спалучэння – грузінскія святы "Тбілісоба", "Цветеніе лозы"; узбекістанскія "Навруз"(Свята вясны), "Гул Байрамі" (Свята кветак), "Хірмон Байрамі" (Свята ўраджаю).

Укараненне народных традыцый і фальклору ў тэатралізаваныя святы і абрады было ў той час адным з важных напрамкаў стварэння іх сцэнарна-рэжысёрскай задумкі практычна ва ўсіх странах. Такі сінтэз даваў штуршок да стварэння новых формаў і мадэрнізацыі старых, якія садзейнічалі мастацкаму асэнсаванню гістарычных падзей, аб'ядноючы ўчарашні і сённяшні дзень, старое і новае. Тым часам, як лічылася, народныя святы неслі новы камуністычны змест. Адзначым таксама, што у розных рэгіенах народныя святы, характэрныя многім славянскім народам, ўвабіралі ў сябе многа своеасаблівага мясцовага каларыту, але асноўныя падзеі святочнай дзеі заставаліся нязменнымі.

Выкарыстанне фальклору ў сваце спрыяла ўмацаванню атмасферы сяброўства, калектывізму, павагі да старэйшых, да сваей гістарычнай спадчыны.

Народныя традыцыі і фальклор з'яўляюцца ў гэты час асновай масавага дзейства, што паказвае іх значную ролю ў актывізацыі аўдыторыі. Гэта вельмі важна з боку методыкі іх выкарыстання ў сценарна-рэжысерскай задуме святаў і абрадаў. Пошук і абрунтаванне такіх прыемаў актывізаціі, ўключэнне чалавека ў масавае дзейства дазволіць позбегнуць памылкі пры сцэнарна-рэжысескай распрацоўцы святаў і абрадаў з пункту гледжання пасіўнай роллі аўдыторыі, яе пераважнай пазіцыі гледача.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як адзначалася вышэй, па граматах вялікіх князёў літоўскіх яўрэям дазвалялася займацца гандлем, ліхвярствам, некаторымі відамі рамёстваў. З другой паловы XVII ст. на рынках і кірмашах Беларусі пачаўся працэс выцяснення яўрэямі мяшчан-беларусаў з крамнага гандлю. Гэты працэс адбываўся таму, што магнаты і гарадскія ўлады разлічвалі атрымліваць пастаянныя даходы з яўрэяў, звязаных кагальнай кругавой парукай. [3, с. 110]

У Цэнтральнай і Усходняй Беларусі слова "кірмаш" абазначала два паняцці : прастольнае, храмавае свята, атаксама штогодні святочны гандаль з забавамі. Пазней у Заходняй Беларусі пад уплывам каталіцкай царквы за храмавымі святамі замацавалася назва "фэст" – народнае свята з масавымі гуляннямі, прымеркаваная да пэўнай даты хрысціянскага календара. Фэстам называлі таксама прастольнае ці храмавае свята, бо звычайна яно праводзілася ў дзень памяці святога, імя якога насіла мясцовая царква. Часцей за ўсе фэсты адзначалі пасля завяршэння сельскагаспадарчых работ. Людзі сустракаліся, абмяркоўвалі розныя пытанні, частавалі адзін аднаго, наладжвалі розныя забавы, хлопцы заляцаліся да дзяўчат, знаёміліся, і гэтыя адносіны нярэдка заканчваліся шлюбам.[4, с. 68.]

У 30-40-я гг. XIX ст. Атрымліваюць пашырэнне спецыялізаваныя кімашы па продажу аднаго віду іавару. У розных гарадах і мясгэчках сіалі ўзнікаць ягадныя, грыбныя, рыбныя, лясныя і іншыя віды штогодніх таргоў. Так, у вёсцы Дзякавічы на возеры Князь знаходзілася так званая рыбарпя, якая ажыцяўлялася ў зімовы час. Сюды прыязджалі рускія купцы з Рыгі і Дынабурга (буйны горад Віцебскай губерні). З суседняга Слуцка таксама прыбывалі купцы-яўрэі, і рыбарня прымала выгляд гандлёвага мястэчка. [1, с. 57]

Штогоднія святочныя таргі з моманту свайго ўзнікнення цесна перапляталіся з духоўнай культурай народа, станавіліся сапраўдным святам народных раместваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кірмаш, як форма святкавання завяршэння сельгасработ, увабраўшы народныя і здабыткі сучаснай святочнай культуры, з'явіўся многафункцыянальным святам, якое дало магчымасць раскрыць прыгажосць і грамадскае значэнне працы, выклікаць пачуццё задаволенасці вынікамі сваёй працоўнай дзейнасці, рэалізаваць разнастайныя матэрыяльныя і духоўныя запатрабаванні людзей.

З другой паловы 40-х гг., пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, на тэрыторыі Заходняй Беларусі пачалі арганізоўвацца калгасы і саўгасы. У гэтых раенах захавалася традыцыя правядзення восеньскіх кірамашоў і фэстаў, таму ўзнікла патрэба правядзення свята ўраджая.

З 1981 г. павялічылася колькасць мястэчак, дзе пачалі аднаўляць кірмашы. У 1982—1984 гг. Пасля завяршэння сельгасработ ён праводзіўся ў Гродне, Скідзелі, Шчучыне, Ваўкавыску, Жыткавічах, Валожыне, Міёрах і іншых мясцовасцях Беларусі. Кожны кірмаш набыў толькі яму ўласцівыя рысы. У значнай ступені гэтаму садзейнічалі і мясцовыя старажытныя забавы, якія выклікалі вялікую зацікаўленасць удзельнікаў свята. Напрыклад, у Жыткавічах папулярнасцю карысталася гандлёвая рыбалка, а таксама гандлёва-гульнёвыя дзеянні "цыганскага табару" з ліку мясцовых цыган (конкурс кавалёў, гаданне, конкурс цыганскагатанца, табарныя песні, конныя выпрабаванні). [1, с. 127]

Вельмі важнай рысай першых адроджаных кірмашоў стала тое, што яны насілі інтэрнацыянальны характар. У Скідзелі, Жыткавічах і Міёрах у кірмашах удзельнічалі дэлегацыі працоўных і творчыя калектывы з суседніх рэспублік, а палескі кірмаш, які штогод праводзіцца на Століншчыне, стаў сумесным святам жыхароў столінскага і дубровенскага (Украіна) раёнаў. Удзел у беларускіх святах гасцей з суседніх рэспублік спрыяў духоўнаму ўзбагачэнню беларускага народа. Беларускія кірмашы ўзбагаціліся атракцыёнамі і "апетытнымі" радамі іншых нацый (літоўская карчма, украінскі шынок, рускі тракцір, польская кавярня, сярэднеазіятская чайхана, малдаўскі вінны склеп), а таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

конкурснымі выступленнямі творчых калектываў на фестывалі мастацтваў. [2, с. 421]

У перыяд з другой паловы 80-х – пачатку 90-х кірмашы набылі значную папулярнасць і іх пачалі праводзіць ва ўсіх раенах Беларусі. У Гродне у межах свята горада сталі арганізоўваць спецыялізаваныя нацыянальныя таргі для розных этнічных груп насельніцтва, наладжваюць выступленні нацыянальных творчых і спартыўных калектываў, праводзяць нацыянальныя гульні і танцавальна-забаўляльныя праграмы.

Такія кірмашы спрыяюць людзям розных нацыянальнасцей, якія пражываюць на Беларусі далучыцца да здабыткаў сваёй нацыянальнай культуры, пагаварыць на роднай мове, паслухаць нацыянальную музыку, паўдзельнічаць у гульнях і забавах. [1, с. 156]

Спіс літаратуры:

1. Гуд, П.А. Беларускі кірмаш / П.А Гуд, Н.І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 270 с.

2. Котлярчук, А.С. Праздничная культура в городах России и Беларуси XVII в.: официальные церемонии и крестьянская обрядность / А.С. Котлярчук. – Спб.: “Петербургское востоковедение”, 2001. – 240 с.

3. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы: летнее-осенние праздники /А.В. Салова [и др.]. – Минск : Юнипрес, 1978. – 480 с.

Лыч, Л.А. Гісторыя культуры Беларусі / Л.А. Лыч, У.І. Навіцкі. – Мінск : Вышэйшая школа, 1997. – 485 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ